# МИНИАТЮРНАЯ КНИГА В БЕЛАРУСИ

***Голубев Владимир Александрович,*** *директор Республиканской научной сельскохозяйственной библиотеки*

Презентация

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ ЯК ЗАХАВАЛЬНІЦА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КНІЖНАЙ СПАДЧЫНЫ: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АСПЕКТ

***Рудакоўская Марына Віктараўна,*** *галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, магістр гуманітарных навук*

Нацыянальная кніжная спадчына з'яўляецца здабыткам кожнага народа, захоўвае і перадае нашчадкам яго духоўную памяць і традыцыі. На працягу тысячагоддзяў функцыі збірання і захавання рукапіснай і друкаванай спадчыны выконвалі бібліятэкі. З цягам часу акумуляцыя і захаванне нацыянальных кніжных здабыткаў стала місіяй нацыянальных бібліятэк.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі валодае найбольш поўнай у краіне і свеце ўніверсальнай калекцыяй беларускіх нацыянальных дакументаў, фармаванне якой пачалося ў 1919 г. у складзе бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 1922 г. пературанай пастановай СНК БССР у Беларускую дзяржаўную і універсітэцкую бібліятэку, а ў 1926 г. – у самастойную Беларускую дзяржаўную бібліятэку. На працягу 80-ці гадоў сваёй гісторыі разам з беларускім народам Нацыянальная бібліятэка перажыла ўсе яго выдатныя поспехі і пакутныя выпрабаванні. Прайшоўшы праз цяжар таталітарнага рэжыму, аднавіўшыся пасля амаль поўнага разрабавання ў час Вялікай Айчыннай вайны, перажыўшы панаванне ідэалагічнай сістэмы, Бібліятэка захавала адданасць прынцыпам прыярытэту агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў і зберагла для нашчадкаў галоўную нацыянальную каштоўнасць беларускага народа – універсальны фонд дакументаў розных відаў, які сёння налічвае звыш 8 млн. экзэмпляраў, у т. л. больш за 500 тыс. нацыянальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументаў.

Пытанню камплектавання фонду нацыянальных дакументаў кіраўніцтва Бібліятэкі заўсёды надавала першачарговую ўвагу. Пачынаючы з 1920-х гг. Бібліятэка шматразова звярталася ў вышэйшыя органы ўлады рэспублікі з ініцыятывамі набыцця калекцый, якія задавальняліся, “улічваючы велізарную значнасць для культурнага будаўніцтва Беларусі Дзяржаўнай бібліятэкі і асабліва яе беларускага аддзела, павіннага сабраць, па магчымасці, усё, што напісана пра Беларусь і на беларускай мове або надрукавана ў яе межах” [1]. Так былі набыты каштоўныя бібліятэкі Я. Карскага, П. Шэйна і Н. Янчука па беларусазнаўстве, К. Грота па славяназнаўстве, І. Карнілава, С. Гальдштэйна і А. Сапунова па гісторыі Беларусі (бібліятэка А. Сапунова змяшчала 1-е выданне Статута Вялікага Княства Літоўскага), частка бібліятэкі Я. Купалы, бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі, Мінскай духоўнай семінарыі і інш. У 1925 г. у ленінградскага бібліяфіла В. Камарніцкага былі куплены 10 кніг беларускага першадрукара Ф. Скарыны. Супрацоўнікам удалося папоўніць фонды першымі беларускімі газетамі “Наша Доля”, “Наша Ніва”, “Дзянніца”, першымі выданнямі твораў класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Цёткі. Многія беларускія пісьменнікі (М. Грамыка, Ц. Гартны, Я. Лёсік) дарылі Бібліятэцы рукапісы сваіх твораў. Вычарпальную паўнату камплектавання фонду нацыянальных дакументаў забяспечыў абавязковы экзэмпляр кожнага з выданняў БССР, які Бібліятэка атрымлівае з 1922 г. Дзеля рэгістрацыі поўнага рэпертуару беларускага друку з першых гадоў дзейнасці ў Бібліятэцы была арганізавана праца па стварэнні і выданні бягучай нацыянальнай бібліяграфіі – “Летапісу беларускага друку”. Беларускі аддзел здзяйсняў працу па фармаванні рэтраспекцыйнай нацыянальнай бібліяграфіі, у якую ўключалася і бібліяграфія беларусікі. У 1927 г. быў пакладзены пачатак стытастыкі беларускага друку. Як адзначалі прадстаўнікі Расійскай кніжнай палаты ў 1924 г., бібліяграфічная праца Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі была адной з самых наладжаных сярод іншых рэспублік СССР [2]. У наступныя дзесяцігоддзі Бібліятэка падрыхтавала цэлы шэраг фундаментальных навукова-дапаможных бібліяграфічных выданняў па айчыннай гісторыі, гісторыі кнігі Беларусі, беларускай літаратуры, музыцы, тэатру, сярод якіх зводны каталог “Кніга Беларусі. 1517–1917 гг.”, “Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768–1917 гг.)” (1976) і інш.

Акрамя фармавання унікальнага фонду і інтэнсіўнай бібліяграфічнай дзейнасці, Нацыянальная бібліятэка Беларусі выконвае цэлы шэраг функцый рэспубліканскага значэння. Узначальваючы сістэму бібліятэк краіны, Нацыянальная бібліятэка ўдзельнічае ў распрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне бібліятэчнай справы, з’яўляецца каардынацыйным і метадычным цэнтрам рэспубліканскага значэння, нацыянальным цэнтрам міжбібліятэчнага абанемента, міжгаліновым дэпазітарыем Рэспублікі Беларусь, а таксама



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-даследчай установай па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве. Навукова-даследчыя аддзелы бібліятэказнаўства і кнігазнаўства ў яе структуры вывучаюць і метадалагічна забяспечваюць захаванасць нацыянальнага кніжнага багацця, а таксама яго рацыянальнае выкарыстанне ў бібліятэках і інфармацыйных цэнтрах краіны. У рамках рэалізацыі праграмы ЮНЕСКА "Памяць свету" Бібліятэка ўзначальвае распрацоўку нацыянальнай праграмы "Памяць Беларусі"; з 1995 г. рыхтуе і выдае навуковы зборнік "Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі", а з 1998 г. кожныя 2 гады пад эгідай Бібліятэкі праводзяцца Кнігазнаўчыя чытанні – міжнародная навуковая канферэнцыя па гісторыка-тэарэтычных праблемах кнігазнаўства.

Узвядзенне новага будынка Бібліятэкі стане значнай вяхой у яе гісторыі і дасць імпульс для разгортвання яе дзейнасці на новым тэхналагічным узроўні. Дзеля маскімальна эфектыўнага выкарыстання новых магчымасцяў бачыцца неабходным абагульненне яе гістарычнага вопыту. Гісторыя Бібліятэкі ўяўляе безумоўную цікавасць для даследчыкаў бібліятэчнай і кніжнай справы, а таксама культуры Беларусі ў цэлым, бо адлюстроўвае агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай культуры ў XX – пачатку XXI стст. Пры ўсёй плённай дзейнасці супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі, іх унёску ў распрацоўку практычна ўсіх сфер сацыяльнага жыцця, неабходна прызнаць, што гісторыя Бібліятэкі дагэтуль комплексна не вывучана. Найбольш грунтоўнымі ў гэтым кірунку з'яўляюцца працы першага дырэктара Бібліятэкі Іосіфа Бенцыянавіча Сіманоўскага, у якіх разгледжаны вытокі станаўлення Бібліятэкі і яе развіццё ў першыя 40 гадоў існавання: артыкул "Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции" [3] і манаграфія "Белорусская советская библиография. Часть 1" (Мінск, 1965). Разнастайныя аспекты і кірункі работы Бібліятэкі раскрыты ў мностве публікацый у перыядычным друку і кароткіх нарысах яе гісторыі да юбілейных дат. Звесткі пра гэтыя крыніцы сабраны ў тэматычных бібліяграфічных паказальніках "Нацыянальная бібліятэка Беларусі. 1922–1992" і "Нацыянальная бібліятэка Беларусі. 1991–1995".

У пачатку 1980-х гг. была ўсвядомлена неабходнасць напісання манаграфіі па гісторыі Бібліятэкі, што выявілася ў выданні рэкамендацый яе будучым аўтарам [«Рекомендации авторам коллективной монографии "Национальная библиотека Беларуси: итоги и перспективы развития (1922–1982)». Минск, 1981]. На жаль, гэты праект у свой час не быў рэалізаваны, а прыведзеныя рэкамендацыі па стварэнні манаграфіі сёння відавочна патрабуюць актуалізацыі. У 2002 г. да 80-гадовага юбілею Бібліятэкі быў выдадзены надзвычай каштоўны для сучаснікаў і нашчадкаў зборнік успамінаў старэйшых супрацоўнікаў установы пад назвай "С любовью о библиотеке", у якім паказаны нефармальны бок жыцця Бібліятэкі, лёсы і характары людзей, якія стваралі яе гісторыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згаданыя крыніцы раскрываюць толькі пэўныя аспекты развіцця Бібліятэкі і не даюць магчымасці комплексна ўявіць яе гісторыю. Вывучэнне дзейнасці Бібліятэкі ў розныя гістарычныя перыяды патрабуе грунтоўнай крыніцазнаўчай базы, аснову якой павінны скласці адны з найбольш каштоўных гістарычных першакрыніц – нарматыўныя прававыя акты і службовыя дакументы. З улікам гэтага ў 2004 г. у Бібліятэцы была распачата рэалізацыя навукова-даследчай работы па складанні зборніка "Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў дакументах. 1921–2005 гг.". Праца ажыццяўлялася ў межах навуковага праекта "Бібліятэчная справа на Беларусі. Дакументы і матэрыялы", пачатак якога быў пакладзены ў 1970-я гг., а вынікам стала выданне чатырох дакументных зборнікаў па гісторыі бібліятэчнай справы, якія ахапілі перыяд з 1918 г. па 1990 г.

НДР зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ і падрыхтавана да выдання ў 2006 г. Зборнік уяўляе з сябе сістэматызаванае выданне поўных тэкстаў нарматыўных прававых актаў і службовых дакументаў, якія захоўваюцца ў архіўных фондах і апублікаваны ў афіцыйных выданнях, а таксама асобных публікацый, якія асвятляюць перыяды станаўлення і развіццця Бібліятэкі.

Гісторыя гэтай установы неаддзельная ад гісторыі беларускай дзяржавы. Ад стану дзейнасці Бібліятэкі шмат у чым залежала і залежыць цяпер развіццё навукі і культуры рэспублікі. Названыя сферы ўвесь час знаходзіліся пад кантролем дзяржавы, і таму вывучэнне гісторыі Бібліятэкі не можа быць паспяховым без шырокага выкарыстання дзяржаўных архіўных фондаў. З моманту заснавання бібліятэка знаходзілася ў падпарадкаванні Народнага камісарыята асветы БССР, у 1945 г. перайшла ў падначаленне Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры Савеце Міністраў БССР, а з 1953 г. па цяперашні час уваходзіць у лік устаноў, падведамасных Міністэрству культуры БССР (Рэспублікі Беларусь). Менавіта ў названых ведамствах вырашаліся аператыўныя, арганізацыйныя, планава-эканамічныя і іншыя пытанні дзейнасці Бібліятэкі. Прынцыповыя ж моманты, якімі вызначалася яе месца ў грамадскім жыцці рэспублікі, канцэптуальныя асновы зместу яе дзейнасці вырашаліся толькі на ўзроўні Савета Народных Камісараў (Савета Міністраў) БССР, Цэнтральнага выканаўчага камітэта і, безумоўна, ЦК КП(б) Беларусі.

Пошук дакументаў названых органаў дзяржаўнай і партыйнай улады ажыццяўляўся ў афіцыйных выданнях і фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Былі вывучаны такія выданні як Збор законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў Савета Міністраў Беларускай ССР, Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Збор пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, а таксама БД прававой інфармацыі Нацыянальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтра прававой інфармацыі “Эталон”. У Нацыянальным архіве метадамі суцэльнага і выбарчага прагляду архіўных спраў было вывучана 14 фондаў, сярод якіх, акрамя фондаў вышэйназваных органаў улады, былі таксама даследаваны фонды Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР, Галоўнага ўпраўлення па ахове дзяржаўных тайн у друку пры Савеце Міністраў БССР (т. зв. Галоўліта БССР), БДУ, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. Асаблівую цікавасць ўяўляюць дакументы Галоўліта (фонд 1195), якія, па вядомых прычынах, у гады савецкай улады захоўваліся пад грыфам “Строга сакрэтна” і былі закрыты для даследчыкаў. Дакументы гэтага фонду не ўключаны ў вышэйзгаданыя зборнікі дакументаў па бібліятэчнай справе, выдадзеныя Бібліятэкай, і ў нашым выданні ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак. Вялікую цікавасць уяўляе таксама фонд 546 (Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І. Леніна), які змяшчае лакальныя нарматыўныя прававыя дакументы Бібліятэкі і службовую перапіску, што шмат у чым дапаўняе і канкрэтызуе змест нарматыўных прававых актаў агульнадзяржаўнага ўзроўню. У сувязі з тым, што фонд 546 фармаваўся ў Нацыянальным архіве толькі да 1975 г., пошук дакументаў перыяду 1975–2005 гг. ажыццяўляўся ў ведамасных архівах Бібліятэкі і Міністэрства культуры.

Усяго складальнікамі было вывучана больш за 1800 архіўных спраў, у якіх выяўлена звыш 500 дакументаў, што па змесце маюць дачыненне да Бібліятэкі. У выніку аналізу і экспертнай ацэнкі выяўленага матэрыялу быў выдзелены масіў найбольш каштоўных з крыніцазнаўчага пункту погляду дакументаў, якія былі вызначальнымі ў канкрэтныя перыяды гісторыі Бібліятэкі або комплексна раскрылі яе дзейнасць на пэўных этапах. Іх ўключылі ў паўнатэкставую частку зборніка, якая змясціла 156 дакументаў, з іх 86 публікуюцца ўпершыню. Тэксты раскрываюць дзяржаўныя падыходы да разумення задач і функцый Бібліятэкі ў розныя гістарычныя перыяды, яе месца і ролю ў развіцці бібліятэчнай справы і ў цэлым грамадскага жыцця рэспублікі, а таксама тэндэнцыі і асаблівасці гістарычнага развіцця такіх кірункаў яе дзейнасці, як фармаванне бібліятэчных фондаў, абслугоўванне чытачоў, бібліяграфічная, навукова-метадычная, навукова-даследчая і выдавецкая дзейнасць, праблемы кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Вялікая колькасць дакументаў прысвечана праблемам камплектавання фонду нацыянальных дакументаў, асаблівую цікавасць уяўляюць нарматыўныя прававыя акты і службовая перапіска па пытаннях набыцця прыватных кнігазбораў, частка якіх была вырашана станоўча, а частка так і засталася нерэалізаванымі ініцыятывамі, як, напрыклад, перадача Беларусі бібліятэкі Рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Ленінградзе або выдзяленне кнігасховішчамі СССР дублетных экзэмпляраў старадрукаваных беларускіх кніг.

Дакументы, якія часткова паўтараюць або дэталізуюць змест першай групы, былі выдзелены для напісання каментараў да поўных тэкстаў. Усяго ў зборніку пракаментавана 67 дакументаў. У камен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тарах выкарыстана 169 дакументаў, з іх 129 упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак. Нарэшце, астатнія дакументы былі ўключаны ў спіс тых, якія не ўвайшлі ў зборнік. Спіс складаецца з 187 пазіцый, 172 дакументы ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот.

Такім чынам, усяго ў зборніку выкарыстана 492 дакументы. З іх 387 уведзены ў навуковы ўжытак упершыню, прычым большая частка з іх належыць да перыяду 1921–1960 гг.

У сувязі з тым, што ў Беларусі да гэтага часу не выпрацаваны рэкамендацыі па выданні зборнікаў гістарычных дакументаў, археаграфічная апрацоўка ажыццяўлялася згодна з "Правилами издания исторических документов в СССР" (Москва, 1990). У легендах да дакументаў прыведзена максімальна поўная інфармацыя з указаннем месцазнаходжання ў архіўных фондах і ўсіх крыніц для апублікаваных дакументаў.

Змест паўнатэкставай часткі дапаўняюць дадаткі: "Асноўныя статыстычныя паказчыкі дзейнасці Бібліятэкі ў 1922–2005 гг.", "Хроніка дзейнасці Бібліятэкі", "Супрацоўнікі Бібліятэкі – лаўрэаты дзяржаўных узнагарод", "Супрацоўнікі Бібліятэкі, якія маюць вучоныя і акадэмічныя ступені", а таксама мультымедыйны дадатак на CD-ROM "Бібліятэка ў фотаздымках", для складання якога выкарыстаны фонды ведамаснага архіва Бібліятэкі і асабістыя фотаархівы супрацоўнікаў. Апошнія 3 дадаткі маюць мэтай персаніфікаваць гісторыю Бібліятэкі і падкрэсліць, што яе галоўным багаццем і гонарам заўсёды былі яе супрацоўнікі, дзякуючы адданай працы якіх Бібліятэка заняла належнае месца сярод нацыянальных бібліятэк свету.

З мэтай максімальна поўнага раскрыцця зместу апублікаваных дакументаў сфармаваны навукова-даведачны апарат зборніка, які ўключае прадмову, імянны і прадметны паказальнікі, спіс скарачэнняў, спіс выкарыстаных крыніц.

Зборнік "Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў дакументах. 1921–2005 гг." стане каштоўнай крыніцазнаўчай базай для даследчыкаў яе гісторыі.

**Заўвагі**

1. НАРБ, ф. 6, воп. 1, спр. 211, л. 60.
2. НАРБ, ф. 42, воп. 1, спр. 535, л. 20.
3. 40 лет библиотечного строительства в СССР : доклады научной конференции (Москва, 23–26 декабря 1957 г.). – М., 1958. – С. 191–286.

Прэзентацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ